Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 03/11/2026 15:46:04

DOI:10.17951/sb.2016.10.169
Studia Białorutenistyczne 10/2016 Literaturoznawstwo

Сяргей Кавалёў / Siergiej Kowalow

Uniwersytet Marii Curie-Skłodowskiej w Lublinie (Polska)
Maria Curie-Skłodowska University in Lublin (Poland)

e-mail: siergiej.kowalow@poczta.umcs.lublin.pl

Раман Нікі Ракіцінай *Ганітва* ў кантэксце развіцця жанру фэнтэзі ў беларускай літаратуры

Nika Rakitina's Novel "Gonitva" (Chase) in the Context of the Development of the Fantasy Genre in Belarusian Literature

Powieść Niki Rakitiny „Gonitwa" w kontekście rozwoju gatunku fantasy w literaturze białoruskiej

Жанр фэнтэзі, надзвычай папулярны сёння ў сусветнай літаратуры, асацыруецца найперш з творамі Джона Рональда Толкіена і ягоных паслядоўнікаў, але свае вытокі бярэ ў казачна-фантастычнай літаратуры XIX ст[1]. У беларускай літаратуры перадгісторыя гэтага жанру таксама сягае XIX стагоддзя (*Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях* Яна Баршчэўскага), у пазнейшыя часы элементы фэнтэзі можна знайсці ў творах Вацлава Ластоўскага (*Лабірынты*) і Уладзіміра Караткевіча (*Ладдзя Роспачы*, *Легенда аб бедным д'ябле і аб адвакатах Сатаны*). Але па-сапраўднаму, так бы мовіць свядома, жанр фэнтэзі ў беларускай літаратуры стаў развівацца толькі ў канцы XX стагоддзя (*Пераможцы* Максіма Клімковіча, *Каханка д'ябла, або Карона Вітаўта Вялікага* Міраслава Адамчыка і Максіма Клімковіча), а ў пачатку XXI ст. у беларускай літаратуры ўзнікае цэлы шэраг тэкстаў, якія несумненна належаць да гэтага жанру (*Дзеці гамункулуса* Людмілы Рублеўскай, *Нашчадкі неўраў* і *Анамалія* Алеся Бычкоўскага, *Сад замкнёных гор* і *РОК@НАТ* Сержука Мінскевіча, *Дванаццаць подзвігаў Геракла* Пятра Васючэнкі і інш.).

Несумненна, фэнтэзі – адзін з самых новых жанраў беларускай літаратуры і менавіта літаратуры XXI ст. (ніводны з твораў XX ст., якія з перспектывы сённяшняга дня можна аднесці да жанру фэнтэзі, не атрымаў такую жанравую

[1] Гл.: A. Sapkowski, *Rękopis znaleziony w smoczej jaskini. Kompendium wiedzy o literaturze fantasy*, Warszawa 2001; G. Trębicki, *Fantasy. Ewolucja gatunku*, Kraków 2007.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 03/11/2026 15:46:04

пазнаку ад саміх аўтараў, якія карысталіся іншымі азначэннямі: *казка, легенда, прыпавесць, фантасмагорыя, трылер*).

Здавалася б, можна смела сцвярджаць, што жанр фэнтэзі стала прапісаўся ў беларускай літаратуры: з'яўляюцца новыя мастацкія тэксты і літаратуразнаўчыя даследаванні[2], у даведніку *100 слоў пра сучасную беларускую літаратуру* Аксана Бязлепкіна палічыла неабходным прысвяціць некалькі старонак гэтаму жанру:

> **Фэнтэзі** – жанр фантастычнай літаратуры, заснаваны на стварэнні новай рэчаіснасці, фізічныя законы якой не адпавядаюць наяўнай рэчаіснасці, з выкарыстаннем міфалагічных і казачных матываў, блізкі да гісторыка-прыгодніцкага рамана, героі сутыкаюцца з надзвычайнымі істотамі, якія для выдуманага свету з'яўляюцца нормай, у творах часта пануе дух Сярэднявечча. […] На беларускай глебе папулярнымі з'яўляюцца фальклорная фэнтэзі, сюжэт якой грунтуецца на нацыянальнай міфалогіі (Л. Рублеўская, М. Шамякіна, Н. Ракіціна), гістарычная, гумарыстычная (С. Мінскевіч), дэтэктыўная (Л. Рублеўская), гарадская фэнтэзі (А. Бычкоўскі), фэнтэзі, у якой паралельна суіснуюць тэхнагенная цывілізацыя і казачна-фантастычны свет (Р. Баравікова), жаночая фэнтэзі, для якой характэрны вострасюжэтнасць, зварот да міфалогіі, багатая сімволіка, глыбіня партрэтных характарыстык герояў, сярод якіх галоўны персанаж – жанчына (Л. Рублеўская, Г. Багданава), касмічная фэнтэзі (Р. Баравікова, С. Мінскевіч)[3].

З іншага боку, у свядомасці чытачоў фэнтэзі асацыіруецца пераважна з замежнай літаратурай, беларускае фэнтэзі ўспрымаецца як нейкая экзотыка, прывідная з'ява і кожны аўтар, які звяртаецца да гэтага жанру адчувае сябе наватарам-першапраходцам. Напрыклад, раман Аляксея Шэіна *Сем камянёў* выйшаў у Мінску у 2015 г. з пазнакай: „Першае беларускае прыгодніцкае фэнтэзі".

Яшчэ адна праблема – пэўная штучнасць, невысокі мастацкі ўзровень большасці беларускіх фэнтэзі, іх значэнне для нацыянальнай літаратуры не выйшла пакуль за рамкі творчага эксперымента, стараннага наследавання сусветным узорам, імкнення даказаць, што, маўляў, і я, беларускі аўтар, магу пісаць так, як Джордж Марцін, як Анджэй Сапкоўскі, як Марыя Сямёнава (менавіта гэтая перашкода ўзнікла перад намі, калі ўзяўшыся пісаць артыкул пра беларускае фэнтэзі, давялося чытаць некаторыя творы). На шчасце, у кожным жанры бываюць выключэнні і такім выключэннем для беларускага фэнтэзі стаў раман Нікі Ракіцінай *Ганітва*, які чытаецца з цікавасцю і несумненна ўвойдзе у гісторыю айчыннай літаратуры – яшчэ не як мастацкі шэдэўр, але як адметны культурны артэфакт.

---

[2] М. Аммон, *Сучасная беларуская літаратурная фантастыка: паэтыка, тыпалагія, кантэкст,* аўтарэферат дыс. на атрыманне вуч. ступені канд. філалагічных навук, Мінск 2013; К. Князева, *Жанравая разнастайнасць сучаснай беларускай фэнтэзійнай літаратуры,* Віцебск 2007.

[3] А. Бязлепкіна, *100 слоў пра сучасную беларускую літаратуру*, Мінск 2012, с. 193.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 03/11/2026 15:46:04

Адразу зазначу, што апублікаваны ўпершыню ў Рызе ў 2008 г. раман *Ганітва* (*Гонитва*) напісаны на рускай мове і ягоная прыналежнасць да беларускай літаратуры можа выклікаць пярэчанне (згадаем колішнюю дыскусію ў часопісе „Arche" вакол выказвання Адама Глобуса, што да беларускай літаратуры належаць толькі творы, напісаныя на беларускай мове[4]). Прысвяціўшы праблеме шматмоўнасці беларускай літаратуры некалькі публікацый[5], я лічу, што сучасная рускамоўная літаратура Беларусі – з'ява гетэрагенная (як лацінамоўная і польскамоўная літартура Беларусі XVI–XIX стст.) і належыць адразу дзвюм культурам: расійскай (паводле мовы) і беларускай (паводле месца жыхарства аўтара і зместу твораў). Некаторыя літаратуразнаўцы (У. Гніламёдаў, С. Ганчарова-Грабоўская) лічаць рускамоўную літаратуру Беларусі натуральнай часткай нацыянальнай беларускай літаратуры[6], а А. Бязлепкіна вылучае і размяжоўвае два паняцці:

> 1) **руская літаратура Беларусі** (творы знаходзяцца ў кантэксце рускай культуры, звязана з Беларуссю толькі як месца жыхарства аўтара, мае вельмі апасродкаванае дачыненне да Беларусі і беларускай культуры; 2) **рускамоўная літаратура Беларусі** (знаходзіцца ў кантэксце менавіта нацыянальнай культуры, з'яўляецца часткай нацыянальнай літаратуры, транслюе беларускую ментальнасць, напрыклад, творчасць С. Алексіевіч)[7].

Калі карыстацца тэрмінамі, прапанаванымі А. Бязлепкінай, раман Нікі Ракіцінай *Ганітва* трэба несумненна залічыць да *рускамоўнай*, а не да *рускай* літаратуры Беларусі, бо гэта якраз той выпадак, калі

> акрамя фармальнага згадвання ў тэкстах імёнаў беларускіх асветнікаў, палітычных і культурных дзеячаў, мясцовых тапонімаў […] ажыццяўляецца апеляцыя да айчыннай гісторыі, асэнсаванне культурных рэалій і нацыянальна-культурных асаблівасцей Беларусі[8].

Раман *Ганітва* (у адрозненні ад іншых твораў Н. Ракіцінай) адметны плённым выкарыстаннем нацыянальных літаратурных традыцый і культурных кодаў, смелай постмадэрністычнай гульнёй з гэтымі традыцыямі і кодамі.

---

[4] *Драпежныя вавёркі беларускага лесу: актуальныя праблемы сучаснай літаратуры. Круглы стол-трагіфарс,* „Arche" 2009, № 10, с. 6–12.

[5] С. Ковалев, *Полилингвизм как особенность „малых" литератур (на примере развития белорусской литературы в XVI веке),* [в:] *Белорусская литература как модель развития „малых" (славянских) литератур*, ред. Г.-Б. Колер, П. Науменко, Минск 2013, с. 91–114; S. Kavalou, *Rosyjskojęzyczna literatura wobec Białorusi: ekspansja czy tradycja wielokulturowości?*, „Porównania" 2014, nr 15, s. 257–266.

[6] С. Гончарова-Грабовская, *Предисловие*, [в:] *Русскоязычная литература Беларуси конца XX – начала XXI века,* ред. С. Гончарова-Грабовская, У. Верина, Минск 2010, с. 3; В. Гниломедов, *На рубеже времени. Русскоязычная поэзия Беларуси,* Минск 2013, с. 3–4.

[7] А. Бязлепкіна, *op. cit.,* s. 156.

[8] *Ibidem*, s. 157.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 03/11/2026 15:46:04

Раман Нікі Ракіцінай мае прысвячэнне: „Героям польского восстания 1831 года”[9]. Слова „польскі” у гэтым прысвячэнні выклікае пэўнае недаўменне, бо “польскім” паўстанне было з пункту гледжання ўладаў Расійскай імперыі, з пункту гледжання сучаснай беларускай гістарыяграфіі яно было польска-беларуска-літоўскім. Напрыклад, для беларускага літаратуразнаўца, даследчыка літаратуры XIX ст. Ігара Запрудскага няма сумнення, што раман *Ганітва* прысвечаны паўстанню 1830–1831 гадоў на Беларусі: „Амаль жа парадаксальна тое, што першы раман пра паўстанне 1830–1831 гадоў на Беларусі – містычны і выдадзены быў не дзе-небудзь, а ў Рызе – і на рускай мове”[10].

У Ганітве спалучаюцца жанравыя ўласцівасці альтэрнатыўнай гісторыі, неагатычнага дэтэктыва і фэнтэзі. Дзеянне рамана адбываецца ў 1828–1831 гг. у маленькай краіне Лейтаве, якую на пачатку XIX ст. заваявала яшчэ меншая краіна Шэневальд. Зразумела, што ў свядомасці чытача Лейтава адразу асацыіруецца з Літвой і Беларуссю, а Шэневальд – з Прусіяй, бо аўтарка не ўкрывае таго, што сталіцай Лейтавы з’яўляецца Вільня, а Шэневальд – нямецкае герцагства[11]. Ды і асаблівасці менталітэту жыхароў Лейтавы выклікаюць адназначныя асацыяцыі з асаблівасцямі нацыянальнага характару беларусаў. „Я очень уважаю ваш народ, его терпимость в вопросах веры, его трудолюбие, удивительные вышивки и песни. Но некоторого… я просто не понимаю! Вас унижают, а вы гнетесь в рабской покорности!”[12] – здзіўляецца баранэса Франя Цванцігер.

Неўзабаве пасля нямецкага заваявання ў Лейтаве ўспыхнула паўстанне, падрыхтаванае рэвалюцыйна-вызваленчай арганізацыяй „Стража” і жорстка падаўленае ўладамі на чале з тагачасным віленскім генерал–губернатарам Генрыхам Айзенвальдам. Адной з прычын паражэння паўстання сталася нібыта здрада графіні Севярыны Маржэцкай, якая выдала планы і спісы ўдзельнікаў паўстання свайму каханку, Генрыху Айзенвальду, за што была пазней застрэлена па прыгаворы „Стражы” Ігнаціем Лісоўскім, заслужыўшым славу нацыянальнага героя. Але праз дваццаць гадоў пасля паражэння паўстання ў Лейтаве зноў робіцца неспакойна: прападаюць чыноўнікі, кур’еры і нават невялікія вайсковыя атрады, адбываюцца невытлумачальныя розумам з’явы.

Занепакоены сітуацыяй правячы герцаг Шэневальда Інгестром Отта Каўніц выклікае з адстаўкі старога Генрыха Айзенвальда і дасылае яго ў снежні 1830 года ў Лейтаву з сакрэтнай місіяй: высветліць, што насамрэч адбываецца ў заваяванай краіне. Настойлівае жаданне зразумець сэнс таго, што адбываецца, узнікае, зрэшты, не толькі ў нямецкага герцага, але і ў чытача рамана, бо ў першых васьмі раздзелах твора дзеянне з кінематаграфічнай хуткасцю пераносіцца з аднаго на-

[9] Н. Ракитина, *Гонитва,* Минск 2011, с. 3.

[10] І. М. Запрудскі, *Метафізіка беларускай літаратурнай крытыкі: артыкулы, нататкі, рэцэнзіі, водгукі*, Мінск 2013, с. 200.

[11] Фігуруе ў рамане *Ганітва* і краіна Балтакрэвія, якую лакалізаваць значна цяжэй.

[12] Н. Ракитина, *op. cit.,* s. 27.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 03/11/2026 15:46:04

селенага пункта Лейтавы ў іншы, з 1830-га года ў год 1827-ы, ад гераіні па імені Гайлі, якая не памятае, хто яна, і то скача на конях з наўямі, то ратуецца ад іншых, нязнаных ёй вершнікаў–прывідаў, да героя па імені Алесь, які кахаецца з Гайлі і робіць ёй матрыманіяльную прапанову, з сумам успамінае сваю нявесту Антаніну Легніч, легкадумна лазіць у вакно да яе сястры Юліі і вельмі падабаецца маладзенькай Франі Цванцыгер. У перапынках паміж амурамі герой атрымлівае магічны падарунак ад Вужынага Караля, робіць кровапусканне варажбітцы Ульрыцы, разрывае магілу і спрабуе ажывіць наўку Севярыну, прысутнічае пры сенсацыйным археалагічным адкрыцці, зробленым прафесарам Долбікам-Вараб'ём, і, што самае цікавае, знаходзіцца адначасова ў двух месцах: у фамільным склепе князёў Ведрычаў у якасці нябожчыка і ў маёнтку Цванцыгераў у якасці аканома[13].

З'яўленне нямецкага арыстакрата ў якасці галоўнага героя надае нарацыі строгасць і няспешнасць, якой так бракавала ў першых раздзелах, а яшчэ прыўносіць у раман–фэнтэзі элементы дэтэктыва. Паспяховаму выкананню місіі Айзенвальда спрыяе таямнічы выпадак: па дарозе ў Вільню на сані генерала нападае зграя ваўкоў, але герой не гіне, а апынаецца ў пустым доме (як потым высвятляецца, у тым самым маёнтку Ліскна, дзе загінула калісьці графіня Маржэцкая), там Генрых нечакана зноў робіцца маладым і атрымлівае ў дар ад нябачнай гаспадыні нязнаныя яму магічныя ўласцівасці. Айзенвальд знаёміцца з ксяндзом Казімірам Францыскам Гарошкам і ў ягоным касцёле бачыць на падлозе таямнічы Узор, а ксёндз нечакана распазнае ў нямецкім арыстакраце рысы таямнічага лейтаўскага Ганца – варажбіта–ведуна. Дабраўшыся да Вільні, генерал з лістом–рэкамендацыяй правячага герцага Шэневальда адпраўляецца ў архіў тайнай жандармерыі, вывучае рапарты, даносы, паведамленні пра дзіўныя з'явы і невытлумачальныя здарэнні ў Лейтаве за апошнія гады і нарэшце прыводзіць у сістэму абрыўкі ведаў пра Узор, Ганцоў, Ганітву, Гаспадыню Зімы Марэну, Вужынага Караля, рассыпаныя аўтаркай у папярэдніх раздзелах рамана. Галоўным ворагам акупацыйных уладаў і асабістым супраціўнікам Генрыха Айзенвальда аказваецца князь Алесь Ведрыч, які з дапамогай чорнай магіі ўзняў з магілы здрадніцу Севярыну Маржэцкую з мэтай ператварыць яе ў паганскую багіні смерці Марэну і выкарыстаць у барацьбе з нямецкімі заваёўнікамі. З небяспечным планам Ведрыча нязгодны камітэт „Стражы", які выключае князя са сваіх шэрагаў, нязгодны і нашчадак Вужынага Караля Гівойтас Ляжнеўскі, які дае наўцы Севярыне выпіць магічны напой і ператварае яе ў лейтаўскую жрыцу-вядунню, Ганца па імені Гайлі. Гівойтаса па-здрадніцку забівае Алесь Ведрыч, сам князь гіне ад укусу змяі і ператвараецца ў аднаго з вурдулакаў-прывідаў Ганітвы, а ў Лейтаве тым часам пачынаецца паўстанне супраць акупантаў, якое завяршаецца вызваленнем Вільні. Пасля шматлікіх прыгод і ператварэнняў Генрыху Айзенвальду ўдаецца перамагчы фанатычнага Алеся Ведрыча, выратаваць сваю каханую і ўзяць з ёй шлюб, а яшчэ пераканаўча даказаць, што здраднікам у мінулым паўстанні быў

[13] Прызнаюся, што мая першая спроба прачытання рамана *Ганітва* скончылася менавіта на ўступных васьмі раздзелах, да з'яўлення Генрыха Айзенвальда ў якасці галоўнага героя.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 03/11/2026 15:46:04

насамрэч Ігнаці Лісоўскі, а не Севярына Маржэцкая. Праўда, на працягу дзеяння рамана нямецкі генерал праходзіць эвалюцыю ад адданага служкі рэжыму да прыхільніка свабоды Лейтавы, ператвараецца спачатку ў Ганца, а потым і ўвогуле ў Вужынага Караля і невядома, што за будучыня чакае іх з галоўнай гераіняй, якая не хоча быць жахлівай багіняй смерці Марэнай, але і ціхага сямейнага шчасця ў якасці графіні Севярыны Маржэцкай ужо сабе не ўяўляе:

> Я не леплюсь. Я не глина. Я не стану тем, чего вы хотите от меня. Я не стану опять Севериной (хотя Айзенвальда по-настоящему жаль). Я не стану Мореной, как желал Алесь. Хотя именно этого хочет часть моей души. Тьмой нельзя победить тьму. Нельзя? – Гайли на мгновение запнулась. – Нет. Никогда. Потому что моя судьба – искра в ночи. Цветок папоротника. Я – гонец. И это бессмертно. И это то, что есть я. Сейчас и до могилы. А может быть, навечно[14].

Так у скарачэнні, калі бязлітасна адсякаць шматлікія адгалінаванні, выглядае сюжэт *Ганітвы*, і калі ў выпадку аналізу якога-іншага твора падрабязны пераказ сюжэта з'яўляецца банальнай прафанацыяй літаратуразнаўства, то ў выпадку рамана Нікі Ракіцінай рэканструкцыя сюжэта нагадвае стараннае разблытванне клубка нітак і ўяўляецца неабходным этапам даследавання твора. Праўда, цяжка адагнаць ад сябе думку, што пакручастасць і ўскладнёнасць сюжэту *Ганітвы* у значнай ступені тлумачыцца празмерным энтузіязмам і нявопытнасцю аўтаркі: прафесійнаму белетрысту матываў, вобразаў, сітуацый, закладзеных у гэтым творы, хапіла б на некалькі раманаў.

Ганітва – opus vita, твор жыцця Нікі Ракіцінай, які пісаўся на працягу амаль дзесяці гадоў. У рамане адчуваецца добрае веданне законаў жанру, творчае выкарыстанне сюжэтаў і матываў класікі фэнтэзі. Так, вобраз таямнічага Узору, паводле якога Ганцы чытаюць лёсы Лейтавы, нагадвае вобраз Габелену, у які ўплецены лёсы Сусвету, з рамана Гая Гэўрыела Кея *Габелены Ф'ёнавара*, а матыў парадаксальнага спалучэння любові да Бацькаўшчыны і кахання да яе захопніка (Гайлі-Айзенвальд) перагукаецца з падобным матывам у рамане Кея *Тыгана* (Дыянора-Брандзін). Задума Алеся Ведрыча вызваліць родную краіну ад акупантаў, узняўшы з магілы дух здрадніцы Севярыны і ператварыўшы яе ў багіню смерці Марэну, нагадвае спробу карла Нікабрыка вызваліць Нарнію ад узурпатара Міраза з дапамогай чорнай магіі і ўваскрашэння Белай Чараўніцы ў аповесці Клайва Стэйплза Льюіса *Прынц Каспіян* (другая частка *Хронік Нарніі*). З еўрапейскіх фэнтэзі пераляцеў на старонкі *Ганітвы* крылаты сабака Сімаргл, а вобраз паганскай багіні Марэны часта выкарыстоўваецца ў славянскіх фэнтэзі (напрыклад, у рамане Марыі Сямёнавай *Валкадаў*).

Але яшчэ больш цесна звязаны раман Нікі Ракіцінай з беларускай літаратурнай традыцыяй і ў першую чаргу – з аповесцю Уладзіміра Караткевіча *Дзікае паляванне караля Стаха*, да якой *Ганітва* непасрэдна ўзыходзіць. Паралелі са знакамітай

[14] Н. Ракитина, *op. cit.,* s. 345–346.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 03/11/2026 15:46:04

аповесцю Караткевіча назіраюцца ў дэбютным рамане Ракіцінай на многіх узроўнях: у назве, характарах герояў, месцы і атмасферы дзеяння, у замілаванні духам старасвеччыны і, адначасова, у жартаўлівых кпінах з сарматызму.

У прынцыпе, Ганітва – гэта і ёсць Дзікае паляванне: прывідныя вершнікі на конях, якія пераследуюць ворагаў і здраднікаў, заганяюць іх у дрыгву, помсцячы за грахі перад радзімай. Але Ніка Ракіціна не толькі наслядуе Караткевіча, але і палемізуе з ім. Вобраз фанатычнага князя Алеся Ведрыча – гэта своеасаблівы антыпод Алеся Загорскага і Кастуся Каліноўскага з *Каласоў пад сярпом тваім*. А вобраз шляхетнага маўкліўца Гевойтаса Ляжнеўскага – поўная супрацьлегласць каварнага балбатуна Дубатоўка з *Дзікага палявання караля Стаха*.

Галоўны герой аповесці Караткевіча Андрэй Беларэцкі – фальклярыст і літаратар, галоўны герой аповесці Ракіцінай Генрых Айзенвальд выдае сябе за фальклярыста і літаратара, абодва яны выступаюць у ролі дэтэктываў–аматараў і разблытваюць клубок таямнічых выпадкаў і здарэнняў. Але ў адрозненні ад Андрэя Беларэцкага, які за містычнымі з'явамі і прывідамі знаходзіць жывых людзей і іх добра прадуманыя ўчынкі, Айзенвальд за сухімі фактамі і паведамленнямі знаходзіць сапраўдную магію, як і належыць у рамане фэнтэзі.

Акрамя паралеляў і алюзій з караткевічаўскімі творамі ў рамане Нікі Ракіцінай шмат адсылак да беларускай гісторыі, культуры, літаратуры. Большасць з гэтых адсылак маюць характар іранічнай інтэртэкстуальнай гульні, у якой вядомыя з падручнікаў звесткі перамешаны з вымыслам, трансфармаваныя ў літаратурны анекдот пад уздзеяннем буйнай фантазіі аўтаркі. Так, класік беларускай літаратуры Ян Баршчэўскі ператварыўся ў *Ганітве* ў дасціпнага карчмара Канстантыя Баршчэўскага („к гостям катком катился колобок в вышитом жупане, достающем до голенищ навощенных сапог. На пивном брюшке жупан расходился, показывая снежной белизны сорочку, перепоясанную вышитым широким поясом з золотыми кистями. Темя у колобка было лысым как колено, зато седые усы свисали до груди”[15]), а знаны паэт–філамат Тамаш Зан – у бывальца–наведвальніка ягонай карчмы, шчырага аматара беларускіх страў і напояў („Томаш добрался до колдунов и сыпал их в себя, как угли в паровозную топку: только челюсти железными заслонками клацали”[16]).

Варта адзначыць спарадычнае ўжыванне ў рускамоўным рамане *Гонитва* асобных беларускіх слоў і выразаў, якія не толькі надаюць твору моўны каларыт, але і нясуць пэўны ідэалагічны змест. Калі Франя Цванцыгер, немка з паходжання, спявае калядку на рускай мове, Гайлі падхоплівае песню па-беларуску:

> Ночка ціхая зарыста суд-часіна
> Нарадзіла Дзева чыста Бога-Сына…[17]

[15] Н. Ракитина, *op. cit.,* s. 100–101.
[16] *Ibidem*, s. 105.
[17] *Ibidem,* s. 258.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 03/11/2026 15:46:04

Для разумення ідэйна-мастацкага феномену *Ганітвы* шмат дае знаёмства з біяграфіяй аўтаркі. Ніка Ракіціна (сапр. імя – Людміла Багданава) нарадзілася ў 1963 г. у Гомелі ў сям'і выкладчыка і бібліятэкаркі. Яшчэ ў 4-м класе школы бацька даў ёй прачытаць *Дзікае паляванне караля Стаха* і *Хрыстос прызямліўся ў Гародні* Караткевіча, якімі дзяўчына шчыра захапілася. У 1980 г. яна паступіла ў Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ф. Скарыны на аддзяленне „руская і беларуская мова і літаратура", які скончыла ў 1985 г. Працавала настаўніцай у гомельскіх школах, вучылася нейкі час у аспірантуры Інстытута літаратуры Акадэміі навук Беларусі, дзе збіралася пісаць дысертацыю пра творчасць У. Караткевіча. У 1994 г. заснавала ў Гомелі першы рыцарскі клуб, цяпер кіруе дзіцячым літаратурным гуртком пры Гомельскім абласным палацы творчасці дзяцей і моладзі.

Нягледзячы на захапленне творчасцю Караткевіча, Людміла Багданава стала пісаць на рускай мове: спачатку вершы, потым фантастычныя апавяданні, аповесці, раманы–фэнтэзі. Яе станаўленне як пісьменніка адбывалася ў расійскай культурнай прасторы: праз удзел у інтэрнэт–конкурсах і майстар–класах для фантастаў „Басткон", „Росткон", у семінарах Маскоўскага клубу аматараў фантастыкі. Не дзіўна, што апавяданні гомельскай аўтаркі можна сустрэць у расійскіх часопісах і анталогіях фантастыкі, выдадзеных у Маскве, Санкт-Пецярбургу, Екацерынбургу. Ёсць у Нікі Ракіцінай некалькі публікацый і ў беларускім друку[18], але пераважна ў перакладах з рускай мовы альбо ў сааўтарстве з іншымі пісьменнікамі, таму цяжка сказаць у якой ступені валодае яна роднай мовай.

Сваю першую кнігу Ніка Ракіціна выдала даволі позна – у 2008 г., ва ўзросце сарака трох гадоў, але дэбют – была гэта менавіта *Ганітва* – атрымаўся вельмі ўдалым. За свой раман яна атрымала дыплом за лепшы дэбют на міжнародным семінары фантастыкі „Еўракон" у Маскве (першая аўтарка з Беларусі за трыццаціпяцігадовую гісторыю семінара), у беларускім друку з'явілася цэлая серыя інтэрв'ю з гомельскай пісьменніцай-самародкам.

Нягледзячы на паспяховы дэбют і гучны рэзананс у прэсе, далейшая кар'ера гомельскай аўтаркі не набыла развіцця: у 2011 г. невялікае мінскае выдавецтва „Букмастер" апублікавала ранні раман пісьменніцы *Ведьма* (*Танарская ведьма*) і перавыдала *Гонитву*, пазнейшыя аповесці і раманы Нікі Ракіцінай – *Радуга*,

[18] А. Альшанская, Н. Ракіціна, *Наўе.* „Маладосць" 2006, № 3, с. 77–98; Н. Ракіціна, *Глядзець на вогнішча*, „Літаратура і мастацтва" 2006, 13 студзеня, с. 9; Н. Ракіціна, *Пярсцёнак Гелены*, пер. з руск. Ірыны Клімковіч, „Маладосць" 2012, № 12, с.13–20. *Меркаю Караткевіча і фаербола: Гутарка з пісьменнікам-фантастам Нікай Ракіцінай,* гутарыла Дар'я Амяльковіч, „Культура" 2008, 31 мая–6 чэрвеня, с.6; *Казкі для дарослых: Гутарка з пісьменніцай Нікай Ракіцінай,* запісала Віялета Дралюк, „Беларусь" 2008, № 6. с. 44–45; *Літаратурны трыумф Нікі Ракіцінай,* гутарыў Уладзімір Пернікаў, „Звязда" 2008, 6 чэрвеня; *Даўніна вабіць і натхняе: Гутарка з гомельскім пісьменнікам-фантастам Нікай Ракіцінай*, запісала Вольга Карней, „Голас Радзімы" 2008, 17 ліпеня, с. 3; *Міфічная і сапраўдная краіна Нікі Ракіцінай Гутарка з аўтарам рамана „Ганітва",* запісала Ірына Клімковіч, „Літаратура і мастацтва" 2008, 8 жніўня, с. 13.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 03/11/2026 15:46:04

Крипт (у сааўтарстве з Аленай Альшанскай і Нікам Срэдзіным), *Ясень* (у сааўтарстве з Таццянай Кухтай), *Завтрашний ветер* (па матывах камп'ютэрных гульняў „Morrowind" і „Oblivion"), *Ночь упавшей звезды* (у сааўтарстве з Наталляй Мядзянскай) і *Книга кораблей* (у сааўтарстве з Наталляй Мядзянскай) пакуль не зацікавілі выдавецтвы.

Знаёмства з біяграфіяй і творчасцю Нікі Ракіцінай дазваляе зрабіць наступную выснову: *Ганітва* напісана аўтарам–аматарам з пакалення „Тутэйшых", якая ў адрозненні ад сваіх землякоў, выпускнікоў Гомельскага ўніверсітэта імя Ф. Скарыны Анатоля Сыса, Алеся Бяляцкага, Эдуарда Акуліна не пайшла ў беларускую літаратуру, а паспрабавала рэалізаваць свае творчыя амбіцыі ў расійскай культурнай прасторы, дзе яе ўлюбёны жанр фантэзі быў лепш развіты, аднак найбольшага поспеху яна дасягнула, менавіта дзякуючы звароту да нацыянальнага кантэксту, дзякуючы выкарыстанню ў рамане *Ганітва* і ў некаторых апавяданнях беларускай міфалогіі, фальклору, мовы, літаратурных сюжэтаў і гістарычных алюзій.

І менавіта ў беларускай культурнай прасторы *Ганітва* Ракіцінай атрымала найбольшы рэзананс, выклікала высокую ацэнку беларускіх крытыкаў і літаратуразнаўцаў. Што праўда, расійскія рэцэнзенты таксама сустрэлі дэбютную кнігу беларускі Нікі Ракіцінай прыхільна, але выказалі і шэраг крытычных заўваг. Уладзімір Пузій у часопісе „Мир фантастики" справядліва адзначаў:

> Увы, роман Ракитиной обладает целым рядом недостатков, характерных для дебютных книг. Первый и главный – язык. В поисках собственного оригинального стиля писательница иногда забывает о логике и соразмерности: неоправданные длинноты, алогизмы, самоповторы перегружают текст. Чрезмерно количество описаний, выстроенных по схожему принципу: почти в каждом эпизоде обязательно перечисляются растения, предметы обстановки и запахи. Сюжетные линии выстроены неумело: одни эпизоды затянуты, другие – прописаны скороговоркой. Есть и логические прорехи, скажем, немцы-завоеватели заявлены как „плохие", однако нигде не показано почему. Наоборот, один из основных героев генерал Айзенвальд – честен и привлекателен[19].

На няроўнасць стылю Ракіцінай звяртаў увагу і Дзмітры Валадзіхін, праўда лічыў моўныя хібы ў *Ганітве* часткова апраўданымі: „автор склонен к языковым экспериментам. Иногда они выглядят рискованно, и Ника Ракитина получает, скорее, речевую ошибку, вместо оригинального литературного хода. Но порой получаются неожиданные и красивые конструкции"[20].

Беларускія крытыкі літаратуразнаўцы сустрэлі з'яўленне *Ганітвы* з большым энтузіязмам.

[19] В. Пузий, *Революционная романтика Лейтавы,* режим доступа: http://old.mirf.ru/Reviews/review2687.htm, дата доступа: 29.05.2016.

[20] Д. Володихин, „*Гонитва*„ *Ники Ракитиной,* „Если" 2008, № 8, с. 261.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 03/11/2026 15:46:04

Аксана Бязлепкіна ў даведніку *100 слоў пра сучасную беларускую літаратуру* называе *Ганітву* Нікі Ракіцінай сярод шасці найбольш значных твораў рускамоўнай літаратуры Беларусі і сярод сямі найбольш удалых твораў у жанры фэнтэзі[21].

Ігар Запрудскі захоплена піша:

> Уявіце сабе Папялушку. Яна жыве ў захопленым чужынцамі краі. Не істотна, як ён называецца. Але гэта наша з вамі Радзіма. І, па Караткевічу, над ёй „фанабэрыцца п'яны разбэшчаны гун". Мужчыны, мужныя бясконца і дужыя, не змаглі даць рады – „скінуць чужынцаў". Скатаваная прыхаднямі-ліхадзеямі зямля, якую не ў стане абараніць яе сыны, „пакрыўдзілася". Яна нараджае пачвар, што пачынаюць нішчыць усіх і ўся. Хто свой, хто чужы, хто добры, хто зламысны – не разабрацца. Тым больш, што найпершы вораг можа стаць найлепшым добразычліўцам, а найбліжэйшы – зажадаць тваёй смерці. Заблытанасці падддае і „кінематаграфічная" фрагментарнасць кампазіцыі, і прысутнасць выдуманых і рэальных гістарычных персанажаў. І ўсё гэта на фоне прадстаўнічага комплексу рытуалаў і абрадаў, даўніх беларускіх прыкмет і павер'яў. Уся куламеса-крутаверць па-мастацку сінкрэтычна злучана: векавая сялянская мудрасць і шляхецкія кодэксы, рэальная інфармацыя аб прыродзе і рэлігія з народнай мараллю, таямнічыя веды і здабыткі цывілізацыі 30-х гадоў XIX стагоддзя, спосабы кантакту з сіламі іншасвету і калектыўнае падсвядомае, зоамарфізм і прывабна прыхарошаная сацыялагічнасць, якая не цураецца маляўніча выпісаных побытавых падрабязнасцей[22].

Даследчыца беларускай фантастыкі Марына Аммон вылучае раман Нікі Ракіцінай сярод іншых твораў жанру фэнтэзі:

> Галоўнай прычынай крызісу жанру ў XXI ст. выступае яго „паразітаванне" на ўжо гатовай заходнееўрапейскай фальклорна-міфалагічнай мадэлі, трансляванай праз шматлікія тэксты-каноны. Вяртанне фэнтэзі да першапачатковага інтэлектуальна-філасофскага падмурку магчымае пры звароце пісьменнікаў да ўнікальных культурных кодаў свайго народа, што асабліва актуальна ў кантэксце развіцця славянскага фэнтэзі (раман Нікі Ракіцінай *Ганітва*)[23].

Ніка Ракіціна неаднаразова выказала спадзяванне, што некалі *Ганітва* будзе апублікавана па-беларуску. Безумоўна, праявы білінгвізму ў рамане ствараюць пэўную перашкоду для перакладу твора на беларускую (і не толькі на беларускую) мову. Але інтэнцыя аўтаркі выклікае шчырую павагу і, магчыма, некалі рускамоўныя творы Нікі Ракіцінай загучаць па-беларуску як творы Алеся Адамовіча, Кастуся Тарасава і ўвойдуць у залаты фонд нацыянальнай літаратуры. Для дасягнення

[21] А. Бязлепкіна, *op. cit.,* с. 193, 156.
[22] І. Запрудскі, *op. cit.,* s. 200.
[23] М. Аммон, *op. cit.,* s. 19.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 03/11/2026 15:46:04

гэтай мэты таленавітая пісьменніца павінна дасягнуць вышыні, узнятай у *Ганітве*, у сваіх новых творах, чаго пакуль не адбываецца: выдадзены сем гадоў назад дэбютны раман выглядае выпадковай удачай у творчай біяграфіі Нікі Ракіцінай…

Bibliografia

Alszanskaja, A., Rakicina, N. (2006). Naŭje. *Maładosć, 3*, s. 77–98.

Amialkowicz, D. (2008). Mierkaju Karatkiewicza i fajerboła: hutarka z piśmiennikam-fantastam Nikaj Rakicina. *Kultura*, *31.05–6.06*, s. 6.

Ammon, M. (2013). *Suczasnaja biełaruskaja litaraturnaja fantastyka: paetyka, typałohija, kantekst.* Minsk: Autareferat.

Biazlepkina, A. (2012). *100 słou pra suczasnuju biełaruskuju litaraturu.* Minsk: Limaryus.

Draluk, W. (2008). Kazki dla darosłych: Hutarka z piśmiennicaj Nikaj Rakicinaj. *Biełaruś*, *6*, s. 44–45.

Drapieżnyja wawiorki biełaruskaha lesu: aktualnyja prablemy suczasnaj litaratury. Kruhły stoł-trahifars. (2009). *Arche*, *10*, s. 6–33.

Gniłomiodow, W. (2013). *Na rubieże wremieni. Ruskojazycznaja poezija Biełarusi.* Minsk: Galiafy.

Gonczarowa-Grabowskaja, S. (2010). Predisłowije. W: S. Gonczarowa-Grabowskaja, U. Wierina (red.). *Russkojazycznaja licieratura Biełorusi konca XX – naczała XXI wieka* (s. 3). Minsk: RIWŚ.

Karniej, W. (2008). Daŭnina wabić i natchniaje: Hutarka z homielskim pismiennikam-fantastam Nikaj Rakicinaj. *Hołas Radzimy*, *17.07*, s. 3.

Kavalou, S. (2014). Rosyjskojęzyczna literatura wobec Białorusi: ekspansja czy tradycja wielokulturowości? *Porównania*, *5*, s. 257–266.

Klimkowicz, I. (2008). Mificznaja i sapraŭdnaja kraina Niki Rakicinaj: Hutarka z aŭtaram ramana „Ganitwa". *Litaratura i Mastactwa*, *08.08*, s. 13.

Kniaziewa, K. (2007). *Żanrawaja raznastajnasć suczasnaj biełaruskaj fentezijnaj litaratury*. Wiciebsk: Wiciebski Uniwiersitet.

Kowalow, S. (2013). Polilingwizm kak osobiennosć „małych" licieratur (na primiere razwitija biełorusskoj licieratury w XVI wiekie). W: G.-B. Koler, P. Naumienko (red.), *Biełorusskaja licieratura kak model razwitija "małych" (sławianskich) licieratur* (s. 91–114). Minsk: Biznesofset.

Piernikaŭ, U. (2008). Litaraturny tryumf Niki Rakicinaj: Hutarka, *Zwiazda*, *06.06*, s. 4.

Puzij, W. (2008). *Rewolucionnaja romantika Lejtawy.* Pobrano z: http://old.mirf.ru/Reviews/review2687.htm (dostęp: 29.05.2016).

Rakicina, N. (2006). Hladzieć na wohniszcza. *Litaratura i mastactwa*, 13.01, s. 9.

Rakitina, N. (2011). *Gonitwa.* Minsk: Bukmaster. .

Rakicina, N. (2012). *Piarscionak Heleny.* Pier. z rusk. Iryny Klimkowicz. *Maładość*, *12*, s. 13–20.

Sapkowski, A. (2001). *Rękopis znaleziony w smoczej jaskini. Kompendium wiedzy o literaturze fantas.* Warszawa: superNOWA.

Trębicki, G. (2007). *Fantasy. Ewolucja gatunku*, Kraków: Universitas.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 03/11/2026 15:46:04

Wołodichin, D. (2008). „Gonitwa" Niki Rakitinoj. *Jesli*, *8*, s. 261.

Zaprudski, I. (2013). *Mietafizika biełaruskaj litaraturnaj krytyki: artykuły, recenziji, wodguki*. Minsk: BDU.

Summary

The article deals with fantasy, a new genre in Belarusian literature. The origins of this genre can be found in the literature of the nineteenth century (*Nobleman Zavalnya, or Belarus in Fantastic Stories* by Jan Borshchevsky). Researchers note certain elements of fantasy in the works of Vaclav Lastovsky (*Labyrinth*) and Vladimir Karatkevich (*Boat of Despair*, *The Legend of the Poor Devil and Satan's Advocate*). But it is only at the end of the 20th century and the beginning of the 21st century that Belarusian literature witnesses the appearance of a number of works representing the original varieties of the genre: classical, folk, mythological, technocratic, feminist and anti-fantasy. The author of the article analyzes in detail Nika Rakitina's fantasy novel *Gonitva* (*Chase*) written in Russian in 2008. Nika Rakitina's novel is characterized by the productive use of the national literary traditions and cultural codes, as well as the bold postmodern play upon these traditions and codes.

Key words: Russian-language literature of Belarus, fantasy genre, alternative history, adventure novel, national tradition, intertextual connections

Streszczenie

Artykuł został poświęcony nowemu dla literatury białoruskiej gatunkowi – *fantasy*. Początki tego gatunku można odnaleźć już w dziewiętnastowiecznej literaturze (*Szlachcic Zawalna, czyli Białoruś w fantastycznych opowiadaniach* Jana Barszczewskiego), elementy *fantasy* badacze dostrzegają w utworach Wacława Łastowskiego (*Labirynty*) oraz Uładzimira Karatkiewicza (*Statek Rozpaczy*, *Legenda o biednym diable i adwokatach Szatana*). Dopiero jednak pod koniec XX i na początku XXI wieku w literaturze białoruskiej pojawia się szereg utworów, przedstawiających cały przekrój odmian tego gatunku: klasyczną, mitologiczną, technokatyczną, feministyczną, antyfantasy. Autor artykułu szczegółowo analizuje powieść *fantasy* Niki Rakitiny *Gonitwa* (2008). Cechy wyróżniające powieści Rakitiny to wykorzystanie narodowych tradycji literackich oraz kodów kulturowych, odważna gra postmodernistyczna tymi tradycjami oraz kodami.

Słowa kluczowe: rosyjskojęzyczna literatura Białorusi, gatunek fantasy, historia alternatywna, powieść przygodowa, tradycja narodowa, związki intertekstualne

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 03/11/2026 15:46:04

Рэзюме

Артыкул прысвечаны новаму для беларускай літаратуры жанру – фэнтэзі. Вытокі гэтага жанру можна знайсці ўжо ў літаратуры XIX стагоддзя (*Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях* Яна Баршчэўскага), элементы фэнтэзі даследчыкі адзначаюць у творах Вацлава Ластоўскага (*Лабірынты*) і Уладзіміра Караткевіча (*Ладдзя Роспачы*, *Легенда аб бедным д'ябле і аб адвакатах Сатаны*). Але толькі толькі ў канцы XX – пачатку XXI ст. у беларускай літаратуры ўзнікае цэлы шэраг тэкстаў, якія прадстаўляюць адметныя разнавіднасці гэтага жанру: класічную, фальклорна-міфалагічную, тэхнакратычную, феміністычную, антыфэнтэзі. Аўтар артыкула падрабязна аналізуе рускамоўны раман–фэнтэзі Нікі Ракіцінай *Ганітва* (2008). Раман Нікі Ракіцінай адметны плённым выкарыстаннем нацыянальных літаратурных традыцый і культурных кодаў, смелай постмадэрністычнай гульнёй з гэтымі традыцыямі і кодамі.

Ключавыя словы: рускамоўная літаратура Беларусі, жанр фэнтэзі, альтэрнатыўная гісторыя, прыгодніцкі раман, нацыянальная традыцыя, інтэртэкстуальныя сувязі